**Новы пашпарт – пуцёўка ў будучыню.**

Больш за 30 старшакласнікаў – гімназісты, навучэнцы гарадскіх і сельскіх школ раёна – у Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь атрымалі пашпарты. Урачыстая цырымонія прайшла ў СШ №1 горада Шчучына.

– Сёння вы сталі паўнапраўнымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, – зазначыў старшыня райвыканкама Сяргей Васільевіч Ложэчнік. – Гэта не толькі дакумент, які дае права на ўдзел у жыцці краіны, але і вялікая адказнасць. Беларусы ўжо зарэкамендавалі сябе, як талерантныя, разумныя і добрыя людзі, таму ваша задача: памножыць давер і аўтарытэт. Старшыня райвыканкама С.В. Ложэчнік і начальнік Шчучынскага РАУС А.І. Шастайла ўручылі маладым грамадзянам краіны першыя пашпарты і памятныя падарункі.

… Прыгожыя, крыху ўсхваляваныя юнакі і дзяўчаты прымалі шчырыя і пранікнёныя віншаванні ад намесніка старшыні райвыканкама Г.С. Хвядзюк, начальніка аддзела адукацыі У.Р. Дубка, Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына, старшыні раённага савета ветэранаў Э.С. Дзікевіча, начальніка Шчучынскага РАУС А.І. Шастайла, начальніка аддзела па справах моладзі Шчучынскага райвыканкама Т. В. Ганчарук і першага сакратара РК БРСМ А.С. Богдзель.




– Я ганаруся тым, што менавіта ў гэты знамянальны дзень атрымала пашпарт, – адзначыла дзесяцікласніца СШ №1 Аліна Зянкевіч. – Мы нарадзіліся ў цудоўнай краіне. І імя ёй – Беларусь. Мы ўсведамляем, што ад

нас залежыць будучае дзяржавы, і будзем дастойна працягваць лепшыя традыцыі.

Святам гэты дзень стаў і для 16 рабят, якія папоўнілі рады БРСМ. Членскія білеты ім уручылі старшыня раённага савета ветэранаў Эдмунд Станіслававіч Дзікевіч і першы сакратар РК БРСМ Алена Славамiраўна Богдзель.

Яркі калейдаскоп падзей дапоўнілі выступленні выхаванцаў ЦТДіМ і вучняў СШ №1. А пераможцы абласнога конкурсу патрыятычнай песні не толькі парадавалі прысутных сваімі песнямі, але і атрымалі ўзнагароды, якія заваявалі на абласным конкурсе. Юнакі і дзяўчаты ў гэты дзень наведалі музей СШ №1.